В канун женского праздника о «неженской» профессии. Знакомьтесь, пружанские следователи

1 410

07.03.2019 Автор: Katrin

Стагоддзе таму жанчына за рулём аўтамабіля або ў форменным адзенні была сапраўдным цудам і абавязкова прыцягвала позіркі прахожых. У паўсядзённым ужытку мы і цяпер выкарыстоўваем назвы мноства прафесій, якія маюць толькі мужчынскі род: вадзіцель, урач, токар, праграміст, прафесар і нават кіраўнік. Хаця зараз лёгка можна ўбачыць жанчыну, якая сядзіць за рулём камбайна, наладжвае станкі або кіруе прадпрыемствам ці арганізацыяй. І нават служыць следчым.



У **райаддзеле Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь** зараз следчымі служаць тры жанчыны на пастаяннай аснове і яшчэ адна праходзіць практыку. Здаецца, гэта нялёгкая работа па ўсіх параметрах — не жаночая справа, але ж...

Наталія Гурская прыйшла на гэту службу амаль тры дзесяцігоддзі таму. Як яна ўспамінае,

25 ФЕВРАЛЯ 2024 ГОДА
ЕДИНЫЙ ДЕНЬ ГОЛОСОВАНИЯ
Центральная избирательная комис
Республики Беларусь
Брестоблимущество
УСЛУГ
АРЕНД
новый автоб
Автопарк №11 г. Пружан
БЕЛГОССТРА
Представительство
по Пружанскому району

ПОДПИШИТЕСЬ НА НАС

РУБРИКИ САЙТА

Выберите рубрику

СВЕЖИЕ ПУБЛИКАЦИИ

21.02.2024

Сёння свой выбар зрабіў старшыня Пружанскага раённа выканаўчага камітэта Міхаіл Грышкевіч

пачынала служыць у даволі вялікім аддзеле міліцыі, але і там сярод некалькіх сотняў супрацоўнікаў жанчына «ў пагонах» была рэдкасцю. Сёння яна сама кіруе райаддзелам, дзе амаль чвэрць супрацоўнікаў належыць прыгожай палове чалавецтва, і лічыць тэндэнцыю гендарнай раўнавагі станоўчай. Чаму?

На думку Н.У.Гурскай, ніхто не зможа параўнацца з жанчынай па ўседлівасці, адносінах да дробязяў. Нярэдка яна сама была сведкай сітуацый, калі менавіта супрацоўніца даводзіла справу да лагічнага завяршэння, вызначаючы ўсе невялікія дэталі.

Але Наталія Уладзіміраўна абсалютна не згодная з меркаваннем, што жанчына замяняе мужчыну.

— У любой рабоце, а на нашай службе тым больш, нельга шукаць перавагі па палавой прыналежнасці,— лічыць начальнік аддзела.— Якая розніца, хто займаецца справай? Галоўнае, каб да выканання сваіх абавязкаў супрацоўнік ці супрацоўніца ставіліся з адказнасцю, каб людзі верылі табе і нават абвінавачваемыя ці парушальнікі адносіліся да цябе з павагай.

На думку Наталіі Уладзіміраўны, толькі ў супрацоўніцтве можна дасягнуць чаго-небудзь, бо мы разам — на рабоце, дома, ва ўзаемных адносінах — гэта проста дзве палавінкі аднаго цэлага, як і задумана прыродай або вышэйшай сілай.

Вольга Барадоўская пачынала службу ў крыху іншых абставінах: у 2003 годзе, калі прыйшла ў райаддзел, была там не адзінай жанчынай і мела магчымасць падзяліцца сваімі «жаночымі» думкамі з напарніцамі. У Акадэміі МУС, як успамінае Вольга Іванаўна, таксама вучыліся дзяўчаты-курсанты, хаця іх было і не вельмі многа. Яна тлумачыць такую сітуацыю тым, што жанчыне ўсё-такі складана асвойваць гэтую прафесію.

— Сапраўды, жанчына створана прыродай як захавальніца сямейнага дабрабыту, таму многія мастакі малююць яе ў вобразе маці, якая схілілася над калыскай дзіцяці. Тут жа нам нярэдка даводзіцца быць сведкай чалавечай жорсткасці, пераадольваць яе і пры гэтым не даваць свайму сэрцу закамянець.

Вольга мае дваіх дзяцей і для сябе знайшла асаблівую формулу поспеху: на службе яна — строгі следчы, а дома — пяшчотная маці. І такі кампраміс істотна дапамагае ўвесь убачаны негатыў пакідаць перад парогам дома і дарыць сваім блізкім толькі сапраўдную жаночую пяшчотнасць. Аднак і на рабоце жанчына-следчы павінна пастаянна трымаць сябе ў руках. Сапраўды, прыгожая палова чалавецтва больш эмацыянальная, у жанчын, як кажуць, «вельмі блізка слёзы».

— Безумоўна, нялёгка служыць следчым і захоўваць у сабе прыродныя жаночыя якасці,— зазначае **Святлана Мікус**.— Аднак пры разглядзе спраў мы ніколі не абапіраемся на палавую прыналежнасць парушальніка, хаця, магчыма, некаторыя і спадзяюцца, што да жанчыны-злачынцы жанчына-следчы будзе ставіцца больш памяркоўна.

У практыцы Святланы Ігнатаўны была справа, калі менавіта прадстаўніца «слабой паловы» была ініцыятарам злачынства і следчы аднеслася да яе з усёй законнай строгасцю. І гэты выпадак яна запомніла на ўсё жыццё. Па словах следчага, у працы яна найперш кіруецца правілам: да ўсіх ставіцца аднолькава ветліва і ўважліва, кантралюючы свае эмоцыі.

Дыяну Кныш сапраўдная служба следчага яшчэ чакае наперадзе: пакуль яна вучыцца на апошнім курсе міліцэйскай Акадэміі. У групе дзяўчыны аднакурсніц не так ужо і мала, хаця ўсё ж яны застаюцца ў меншасці. Звязана гэта з тым, як лічыць Дыяна Пятроўна, што дзяўчатам складаней паступаць на праваахоўныя спецыяльнасці з-за вялікага конкурсу — амаль 4 чалавекі на месца. Не заўсёды такі выбар падтрымліваюць і родныя, хаця самой дзяўчыне ў гэтым плане пашанцавала.

— Тата, Пётр Паўлавіч, які ў дзяцінстве купляў мне лялькі і калыскі, быў спачатку ўзрушаны, калі пачуў, куды я планую паступаць,— успамінае курсантка.— А потым сказаў: «Малайчына, дачка, зараз ёсць хлопцы, якія нават у армію ісці не жадаюць, дык ты пакажаш ім прыклад».

Дзяўчына-практыкантка прыслухоўваецца да парад сваіх настаўніц і гэту навуку вельмі цэніць, бо ўжо восенню стане для іх паўнацэннай напарніцай. Спакойна Дыяна ставіцца і да таго, што побач у асноўным будуць мужчыны-калегі. Яна спадзяецца, што таксама дакажа сваёй службай права быць нароўні з больш вопытнымі следчымі.

Дарэчы, усе цяперашнія супрацоўніцы райаддзела свае дасягненні і вопыт звязваюць з падтрымкай, якую ім аказваюць афіцэры-калегі. Практычна ва ўсіх сітуацыях, службовых і

21.02.2024

Святочны канцэрт пройдзе ў Пружанах у Дзень абаронцаў Айчыны!

21.02.2024

Аддзел культуры атрымаў дыплом абласнога спаборніцтв па выніках работы за 2023 год

21.02.2024

Пра захаванне і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны гаварылі на пасяджэнні раённа Савета дэпутатаў і маладзёжна парламента

21.02.2024

Кіраўніцтва Пружанскага раёна віншуе з прафесійным святам работнікаў і ветэранаў землеўпарадкавальнай і картографа-геадэзічнай службы

ГОД ЯКАСЦІ



Аддзел культуры атрымаў дыплом абласнога спаборніцтв па выніках работы за 2023 год

21.02.2024




Пра захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны гаварылі на пасяджэнні раённага Савета дэпутатаў і маладзёжнага парламента

21.02.2024



Санаторый «Ружанскі» прымаў удзельнікаў рэспубліканскага семінара-нарады і здзіўляў магчымасцям (+многа фота)

20.02.2024



Выйсцем для інвалідаў стала… скрыня з пяском Ці з'явіцца лавачка на аўтобусным прыпынку каля магазіна ў Сонечным?

19.02.2024



Пружанскія сыры і мас адзначаны на міжнародным конкурсе «Лепшы прадукт — 202

19.02.2024

бытавых, яны могуць разлічваць на дапамогу напарнікаў. І гэтыя спадзяванні заўсёды апраўдваюцца.

— І калі на святочным шэсці мы ідзём у акружэнні мужчын у пагонах, адчуваем толькі пачуццё гонару за свой калектыў,— аднагалосна зазначаюць следчыя.

Алег СІДАРЭНКА, фота аўтара.



Категория *Актуально, Профессия*

Предыдущая запись
Рэцэпты на Біс: асарці на грылі

Следующая запись
97% работающих состоят в профсоюзе. В Пружанах прошло заседание совета районного объединения

ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Ильющенко Виктор Михайлович

8-01632-4-02-80

КОНТАКТЫ

Наш адрес:
г. Пружаны. ул. Красноармейская, д. 78

E-mail редакции:
RRBud2@brest.by


Приём рекламы:
8-01632-4-03-60, 8-01632-4-03-55

Бухгалтерия:
8-01632-4-03-60

Ответственный секретарь:
8-01632-4-01-08

Корреспонденты:
8-01632-4-03-02,
8-01632-4-03-55,
8-01632-3-58-81

ПОДПИСКА



«Раёнка» ў доме — жаданая госця! Чытаем пісьмы нашых любімых чытачоў

04.02.2024



Сёння мы адзначаем 100-годдзе з дня нараджэння былога рэдактара Пружанскай раённай газеты Мікалая Кавалевіча

02.02.2024

САМОЕ КОММЕНТИРУЕМОЕ

Расписание движения поездов по железнодорожной станции Оранчицы + расписание движения автобусов по маршруту Пружаны-Оранчицы-Пружаны + изменение графика движения автобусов по маршруту Пружаны — Засимовичи и Пружаны — Клепачи (действует с 10 декабря 2023) (15)

КАЛЕНДАРЬ

Февраль 2024

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб	
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	1
12	13	14	15	16	17	1
19	20	21	22	23	24	2
26	27	28	29			

« Янв

© 2017 Пружаны | «Раённыя будні» | Все права защищены.